«Развітанне»), П. Броўкі («Магіла байца», «Два клёны»), у ваеннай лірыцы Якуба Коласа не зафіксаваны. Затое той ці іншы аповед прадвызначае мастацкі свет такіх ягоных твораў, як «Над магілай партызана», «Засада», «Крумкачы», «На новы рубеж», «Над Прутам», «Топаль» і інш. У іх у пэўнай ступені выявіліся магчымасці Якуба Коласа як ліра-эпіка, выдатна ўвасобленыя ў яго даваенных паэмах і вершаваных апавяданнях.

Цікава, што твораў аповеднага характару ў паэтаў, якія былі непасрэдна на фронце, значна больш, чым, скажам, у Якуба Коласа ці М. Рыльскага, якія знаходзіліся ў эвакуацыі. Так, яны займаюць вядучае месца ў творчасці А. Куляшова (87 %), П. Панчанкі (40 %), П. Броўкі (38 %), А. Твардоўскага (55 %). Гэтаму ёсць тлумачэнне: паэты-франтавікі на свае вочы бачылі многія знакавыя падзеі, іх не трэба было прыдумваць, можна было ў вершы браць, як кажуць, «жыўцом».

Жанравая своеасаблівасць лірыкі Якуба Коласа перыяду ВАВ (22.06.1941 — 9.05.1945 гг.), у параўнанні з паэтычнай творчасцю некаторых іншых беларускіх паэтаў, а таксама — рускага А. Твардоўскага і ўкраінца М. Рыльскага, добра відаць з наступнай абагульняльнай табліцы, дзе лічбы ў верхнім радку абазначаюць асноўныя жанраваастваральныя вектары — творы 1) услаўленча-заклікальныя, 2) сатырычна-выкрывальныя, 3) медытацыйна-роздумныя і 4) аповедныя:

| Паэты: | 1 | 2 | 3 | 4 | Усяго: |
|---|---|---|---|---|---|
| Якуб Колас | 31 (24,4%) | 20 (15,6%) | 66 (52%) | 10 (8%) | 127(100%) |
| П. Броўка | 19 (35%) | 4 (7%) | 11 (20%) | 21 (38%) | 55 (100%) |
| Максім Танк | 15 (26%) | 1 (2%) | 25 (43%) | 17 (29%) | 58 (100%) |
| П. Панчанка | 9 (9%) | 14 (13%) | 39 (38%) | 41 (40%) | 103(100%) |
| А. Куляшоў | – | – | 2 (13%) | 13 (87%) | 15 (100%) |
| А.Твардоўскі | 9 (16%) | – | 16 (29%) | 32 (55%) | 57 (100%) |
| М. Рыльскі | 31 (45%) | 3 (5%) | 25 (35%) | 11 (15%) | 70 (100%) |

Табліца колькасна пацвярджае як выключны творчы плён Якуба Коласа (127 твораў — супраць 70 — у М. Рыльскага і 57 — у А. Твардоўскага), так і значную перавагу ў яго паэтычнай творчасці вершаў медытацыйна-роздумных (52 %) над вершамі ўслаўленча-заклікальнымі (24,4 %), сатырычна-выкрывальнымі (15,6 %) і асабліва аповеднымі (8 %).

### Літаратура


1. *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Якуб Колас. — Мінск, 2007. — Т. 2.
2. *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Якуб Колас. — Мінск, 2008. — Т. 3.
3. *Купала, Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Янка Купала. — Мінск, 1998. — Т. 5.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. У. Паплаўскі

## Музычная спадчына і творчы шлях Юзафа Ігнацыя і Каятана Крашэўскіх



Герб Ястрабок, якому належыў род Крашэўскіх

Славуты шляхецкі род Крашэўскіх (герба Ястрабок) вядзе свае вытокі з месца Крашэва. З часам род падзяліўся на некалькі галін: мазавецкую, вялікапольскую, валынскую, малапольскую і літоўскую. З 2-й паловы XVIII ст. да літоўскай галіны належыў маёнтак Доўгае, што каля Пружан. Першым вядомым яго спадчыннікам быў віцэ-брыгадзір пяцігорскі, земскі суддзя Юзаф, які прадаў гэтую маёмасць Яну Крашэўскаму (1789—1864). Апошні ж, харунжы пружанскі, ажаніўся з Соф'яй Наленч-Мальскай, з пасагам якой да роду перайшоў і маёнтак Раманава на Падляшшы — даўнія ўладанні Сангушкаў. У Яна Крашэўскага нарадзілася пяцёра дзяцей: Ганна, Ядвіга, Юзаф Ігнацы, Люцыян (жывапісец, адораны рысавальшчык) і Каятан.

*Юзаф Ігнацы Крашэўскі* (1812—1887) быў усебакова адораным чалавекам: пладавітым пісьменнікам, выдаўцом, бібліяфілам, таленавітым ілюстратарам, знаўцам гісторыі, археалогіі, а таксама калекцыянерам і кампазітарам.

Нарадзіўся Ю. І. Крашэўскі 29 ліпеня 1812 г. у Варшаве, куды часова пераехалі яго бацькі з радавога маёнтка Доўгае, хаваючыся ад нападу напалеонаўскіх

войск падчас вайны з Расіяй. Дзяцінства прайшло ў маёнтках Доўгае і Раманава, дзе хлопчык выхоўваўся ў патрыятычным духу і глыбока гуманітарным, у кульце да літаратуры і мастацтва. Ён атрымаў добрую хатнюю музычную адукацыю. З 1822 па 1826 г. вучыўся ў філіі Радзівілаў у Белай Падлясцы, пасля адзін год — у Люблінскай гімназіі, а ў 1827 г. перавёўся ў знакамітую Свіслацкую гімназію, дзе ў вольны час ад вучобы браў прыватныя ўрокі музыкі ў Р. Браўна.

Месца Свіслач належыла рэферэнту Вялікага Княства Літоўскага Вінцэнту Тышкевічу (1757—1816), які ў 1806 г. заснаваў гімназію, забяспечыў яе бібліятэкай, спецыяльнымі навуковымі кабінетамі, рупліва клапаціўся, як аб прафесарска-выкладчыцкім складзе (многія з іх выкладалі ў Віленскім універсітэце), так і аб вучнях. Спачатку вучэльня размяшчалася ў сціплым драўляным будынку. Але ў сваім запавеце В. Тышкевіч абавязаў будучага пераемніка Тадэвуша Тышкевіча пабудаваць новы каменны гмах, які бы прызначаўся выключна для навучання, а побач касцёл. План пабудовы павінна была зацвердзіць рада Віленскага ўніверсітэта. Новы будынак (архітэктурны праект Караля Падчашынскага[1]) быў аддадзены ва ўжытак у 1827 г. Сярод выхаванцаў гімназіі (да закрыцця ў 1881 г.), акрамя Юзафа, Люцыяна і Каятана Крашэўскіх, можна назваць такія значныя постаці, як Напалеон Орда, Плакід Янкоўскі, браты Віктар і Кастусь Каліноўскія, Лявон Зянковіч. Апошні — удзельнік паўстання 1831 г. — у сваіх мемуарах падрабязна апісаў атмасферу і звычаі школы, праграму навучання, а таксама назваў прозвішчы многіх выкладчыкаў і вучняў.

У 1829 г., атрымаўшы атэстат сталасці, Ю. І. Крашэўскі паступіў у Віленскі ўніверсітэт на медыцынскі факультэт. Але, тонка адчуваючы прыроду слова, у хуткім часе перавёўся на кафедру літаратуры. Пры ўніверсітэце дзейнічалі і мастацкія кафедры гравюры, скульптуры, жывапісу і малюнка. Тут выкладалі вядомыя жывапісцы і графікі — Францішак Смуглевіч, Ян Рустэм, скульптар Казімір Ельскі. У класе ўжо немаладога Яна Рустэма Крашэўскі спасцігаў асновы малюнка і жывапісу. Пазнаёміўся з мастаком Вінцэнтам Смалікоўскім — выкладчыкам, з якім і ў пазнейшыя гады быў у блізкіх adносінах і ніколі не саромеўся звяртацца да яго за парадамі ў галіне жывапісу.

У 1830 г. Юзаф Ігнацы спыніў сваё навучанне ва ўніверсітэце, бо за ўдзел у тайным студэнцкім таварыстве быў арыштаваны і пасаджаны ў віленскую турму.

Палітычная актыўнасць і самасвядомасць студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ў XIX ст. былі асабліва высокімі. Вясною 1819 г. у студэнцкім асяроддзі ўзнікла грамадства «Прамяністых», заснавальнікамі якога былі Тамаш Зан, Францішак Малеўскі і Ян Чачот. Іх мэтаю з'яўлялася распаўсюджанне любові да навук і роднага краю. У 1822 г. грамадства закрылі, але тут жа было створана таемнае таварыства філарэтаў і філаматаў. Кіраўніком яго зноў стаў той жа Т. Зан. Пад эгідай навуковага таварыства філаматы мелі свае філіялы ва многіх гімназіях, у тым ліку Люблінскай і Свіслацкай.



Юзаф Ігнацы Крашэўскі

Юзаф Ігнацы Крашэўскі як сумленны і неабыякавы чалавек меў сваю грамадска-палітычную пазіцыю ў час узмоцненай барацьбы за незалежнасць. Пазней, пасля 1853 г., ён напісаў прыгожы партрэт Тамаша Зана, вобраз якога стаў прыкладам чалавека надзвычайнай сілы волі і душэўнай чысціні. У сакавіку 1832 г. Ю. І. Крашэўскі быў выпушчаны з турмы. Аднак да ліпеня 1833 г. знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам, потым пакінуў Вільню і пераехаў у Доўгае, пазней у Гарадзец, што на Палессі, да сваіх добрых знаёмых Урбаноўскіх. Важным вогнівам у развіцці яго сферы інтарэсаў становіцца музыка. Тут ён зразумеў, што, акрамя танцаў і песень, папулярных мелодый і транскрыпцый з опер, існуе іншы свет музыкі — болей дасканалы і прыгажэйшы: інтэнсіўна знаёміцца з творчасцю Гайдна,



Тамаш Зан

[1] Караль Падчашынскі (1790—1860) — архітэктар, педагог. Нарадзіўся ў вёсцы Жырмуны Гродзенскага ваяводства (цяпер Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці). Вучыўся ў Віленскім універсітэце, потым у Акадэміі мастацтваў у Пецярбургу. У 1817—1819 гг. узначальваў кафедру архітэктуры Віленскага ўніверсітэта. Пабудовы К. Падчашынскага адметныя элементамі позняга класіцызму. Аўтар падручніка «Асновы архітэктуры для акадэмічнай моладзі» (т. 1–3. 1828–1857), публікацый і артыкулаў па праектаванні і архітэктуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Моцарта, Бетховена, Берліоза, Ліста, Вэбэра і Шуберта, партытуры якіх, па падпісцы, яму прысылалі з музычных кнігарняў А. Завадскага, А. Каціпіньскага і Р. Фрыдлейна. А таму, менавіта гэтыя партытуры і падручнікі замянялі яму і кансерваторскае навучанне, і прыватных настаўнікаў.

Пачынаючы з 1834 г., ён многа падарожнічаў і як першы пісьменнік-вандроўнік надаў сваім апісанням сапраўдны мастацкі ўзровень, узбагаціў разнастайнымі дэталямі з мінулага і ўспамінамі аб асабістых прыгодах. Свае падарожжы па Беларусі занатаваў у нарысах «Пінск і Піншчына» (1838), «Успаміны Валыні, Палесся і Літвы» (1840), «Малюнкі з жыцця і падарожжаў» (1842), «Адзенне сялян і мяшчан з ваколіц Брэста, Кобрына і Пружан» (1860).

Добра вядома прыхільнасць Ю. І. Крашэўскага да Беларуска-Літоўскага краю, які ў тыя часы традыцыйна называўся «Літвою», а яго жыхары «ліцвінамі». У першыя 15 гадоў амаль усё, што ім напісана, было звязана з Вялікім Княствам Літоўскім: «Гісторыя Вільні» ў 4-х тамах, «Гісторыя Літвы» ў 2-х тамах, «Жыццё Вітаўта», «Апошняя княжна Слуцкая» ў 3-х тамах, «Паэт і свет» у 2-х тамах і інш. Так, Крашэўскага, як і многіх людзей часоў рамантызму, вабілі гістарычныя падзеі, што сведчылі пра патрыятызм продкаў, пра іх імкненне да свабоды, пра іх гатоўнасць ахвяраваць сабою дзеля вызвалення Айчыны.



Віньетка. Ю. І. Крашэўскі




Старонка рукапісу твора Ю. І. Крашэўскага «Пастушыя песні» для фартэпіяна

У 1838 г. Крашэўскі з сям'ёй асталяваўся на Валыні, а наступныя 20 гадоў жыцця для яго аказаліся вельмі творчымі. Юзаф працягваў свае «мастацкія» падарожжы па Валыні, Італіі, Францыі, Бельгіі і Германіі і рабіў шмат замалёвак прыгожых мясцін, гістарычных будынкаў. Як і Н. Орда, прытрымліваўся моднага ў Еўропе стылю voyage pittoresque (артыстычныя вандроўкі).

Юзаф Ігнацы Крашэўскі меў талент мастака: маляваў розныя тыпы сялян, рабіў ілюстрацыі не толькі да сваіх твораў, але да твораў Яўстафія Тышкевіча, Уладзіслава Сыракомлі і інш., гравіраваў і аздабляў вокладкі кніг.

На працягу ўсяго жыцця займаўся публіцыстычнай і выдавецкай дзейнасцю. У 1841—1851 гг. рэдагаваў віленскі часопіс «Athenaeum», а з 1860 г. у Варшаве з'яўляўся рэдактарам газеты «Gazeta Polska».

Літаратурная спадчына Ю. І. Крашэўскага складае каля 600 тамоў. Існуе толькі 317 загалоўкаў асобных твораў і амаль кожны з іх у некалькіх тамах, а як дадаць артыкулы, якія друкаваліся ў розных перыядычных выданнях, то лік тамоў узрос бы да неймавернай лічбы. Здаецца няма аніводнай галіны ведаў, якую бы ён не закрануў: сачыненні па гісторыі і археалогіі (у тым ліку велічэзны том аб выяўленчым мастацтве ў старажытных славян), грунтоўная праца аб іканапісе, паэмы (у вершах), драмы, раманы, апавяданні, камедыі. Сярод пісьменнікаў гэтай пары, пасля Адама Міцкевіча, менавіта Ю. І. Крашэўскі з'яўляецца найбольш выдатнаю асобаю, пладавітым творцам, які не пабаяўся парушыць існуючыя каноны.

У канцы 1868 г. ён заснаваў сваю друкарню, у якой на высокім паліграфічным узроўні выдаваў творы польскіх аўтараў і кнігі польскай тэматыкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Яго асабістая бібліятэка налічвала некалькі тысяч тамоў, сярод якіх старадрукі, гістарычная літаратура, багаты збор гравюр (каля 6 тысяч) і малюнкаў.

Юзаф Крашэўскі, як і яго брат Каятан, нядрэнна іграў на фартэпіяна і пісаў творы для гэтага інструмента. Пакуль што мне ўдалося знайсці толькі два яго сачыненні для фартэпіяна. «Пастушыя песні» (напісаны каля 1844 г.) упершыню былі выдадзены ў зборніку «Танец і вобраз у музыцы XIX стагоддзя» (Мінск, 2008), рукапіс твора знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве (BN, Mf.512). Разгорнутая па фактуры Фантазія A-dur (поўная назва — «Фантазія на аблюбаваны напеў») напісана таксама падчас побыту яго на Валыні з тонкім веданнем прыроды інструмента была выдадзена ў пятым сшытку серыі «Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі» (Мінск, 2009). Гэтыя творы карысталіся папулярнасцю сярод сучаснікаў і выходзілі ў друку. А. Завадскі, які ўтрымліваў музычныя кнігарні ў Гродна, Вільні і Варшаве, у адным лісце да Крашэўскага ў 1844 г. так пісаў: «Твае пастушыя песні пастанавіў выдаць і даўно б яны ўжо пабачылі свет, але Ст. Манюшка, які так ветліва ўзяўся за іх карэктуру і ачышчэнне ад памылак у літаграфіі, да гэтай пары мне яшчэ не вярнуў, у сувязі з уласнымі пільнымі справамі. Калі ж выдам, то вышлю табе 15 асобнікаў».

Ю. І. Крашэўскі цікавіўся амаль што кожнаю музычнаю падзеяй, як у краіне, так і па-за яе межамі. Так ён апекаваўся творчасцю свайго даўняга сябры, яшчэ з віленскіх часоў, Віктара Кажынскага (1814—1867), які асталяваўся ў Пецярбургу і з 1845 г. стаў дырэктарам Александрынскага тэатра. Захавалася багатае і цікавае ліставанне паміж імі. Не без удзелу Ю. І. Крашэўскага і па прыкладу Ст. Манюшкі ў 1854—1855 гг. В. Кажынскім быў створаны «Spiewnik litewski» ў 5 сшытках (усяго 30 песень) на словы Сыракомлі, Крашэўскага, Залескага, Прусіноўскага і Карпіньскага. Першы сшытак пабачыў свет у 1854 г. Вось што пісаў у лісце да Ю. І. Крашэўскага Адам Кіркор, які займаўся выданнем «Літоўскага спеўніка»: «Дапамажыце толькі — мне хочацца прымірыць Віктара з нашай публікай, якая адраклася ўжо ад яго, разумеючы, што ён запамятаваў аб сваіх, ці не, а ён, дабрадушны, заўсёды такі самы, заўсёды дзіця — паэт Літвін — плача пры ўспаміне Вільні»[2]. Цікава, што першы сшытак «Хатняга спеўніка» (Śpiewnik domowy) Станіслава Манюшкі, падрыхтаванага аўтарам да друку ў Вільні, цэнзура забараніла і што ён пабачыў свет у сталіцы Расійскай імперыі. У гэты час у Пецярбургу стварылася даволі моцная калонія выхадцаў з зямель Рэчы Паспалітай. Выдаваўся на польскай мове часопіс «Tygodnik Petersburski», супрацоўнікам якога быў Ю. І. Крашэўскі, які першы і адгукнуўся добразычлівай рэцэнзіяй[3]: «Аўтар «Спеўніка» ёсць адным з тых рэдкіх маладых людзей, што найпрыгажэйшыя гады свайго жыцця прысвяцілі мастацтву, якое пакахалі сэрцам <...>. Талент і дасканаласць пана Ст. Манюшкі ставяць яго ў адзін рад са знакамітымі замежнымі кампазітарамі, якім ён не саступае ні ў авалоданні ўсімі мастацкімі сродкамі, ні багаццем натхнёных мелодый...».



Ю. І. Крашэўскі. Віньетка да тытула «Літоўскага спеўніка» В. Кажынскага. 1854 г.

Неабходна адзначыць, што выданне гэтых «Спеўнікаў», як і іншых вакальных сачыненняў, па-першае, звярнула ўвагу грамадскасці на творчасць паэтаў, большасць з якіх не мела магчымасці друкавацца на радзіме, так як была забаронена цэнзурай, па-другое, найпрасцейшы тып — прыбліжаны да народнай песні, у куплетнай форме, з простымі і лёгкімі да ўспрынящця мелодыямі, якія раскрываюць розныя настроі і сітуацыі, пададзеныя ў тэкстах — выцесніў з рэпертуару замежныя творы і музыку проста дрэннага густу.

З 1859 па 1863 гг. Ю. І. Крашэўскі жыў у Варшаве. Калі пачалося паўстанне супраць царскай улады, ён пад пагрозай высылкі ў Сібір вымушаны быў пакінуць межы Расійскай імперыі, выехаў у Дрэздэн. Да канца жыцця знаходзіўся ў эміграцыі ў Жэневе.

Пасля смерці Яна ў 1864 г. спадкаемцам маёнткаў Раманава, а пазней і Доўгае стаў яго малодшы сын *Каятан Крашэўскі* (1827—1896) — пісьменнік, кампазітар, астраном-аматар, заўзяты калекцыянер. У 2-й палове XIX ст. маёнтак Раманава стаў галоўнай рэзідэнцыяй роду Крашэўскіх. Пасля пажару 1858 г. была адбудавана новая мураваная сядзіба ў класічным стылі з радавым гербам на франтоне. У 70-я гг. на другім паверсе дома мясцілася прасторная бібліятэчная зала з кнігазборам каля 9000 тамоў. Сярод найбольш каштоўных

[2] Ліст А. Кіркора да Ю. І. Крашэўскага (без даты). Korespondencja J. I. Kraszewskiego w zbiorach Biblioteki Jagiellońskiej. Seria III, t. 8, karta 463.

[3] Яшчэ ў маі 1842 г. Манюшка выслаў Ю. І. Крашэўскаму ў рукапісу першы сшытак «Хатняга спеўніка», папрасіўшы яго аб падрыхтоўцы грамадскай думкі для сваёй працы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ



Каятан Крашэўскі

экзэмпляраў былі Статут Вялікага Княства Літоўскага, рэдкія выданні кніг Бібліі, Астралогія 1521 г., выдадзеная ў Венецыі, амаль што поўныя камплекты першых выданняў А. Міцкевіча і Ю. І. Крашэўскага. Збор старажытных дакументаў уключаў 16 пергаментаў XIV і XV стст. У аддзеле рукапісаў, каля 100 адзінак — аўтографы і лісты знакамітых гістарычных асоб, у тым ліку 120 лістоў Тадэвуша Касцюшкі, перапіска з Уладзіславам Міцкевічам, Зыгмунтам Глогерам і Антоніем Пяткевічам, больш за 600 лістоў Ю. І. Крашэўскага.

Каля бібліятэкі была пабудавана ў 1856 г. астранамічная абсерваторыя з апаратурай, набытай у Мюнхене, Берліне, Вене і Парыжы. Яшчэ 17 лістапада 1855 г. ён пісаў да брата Юзафа Ігнацыя: «Чакаю цяпер на некаторыя астранамічныя інструменты з Парыжа <…>, маю апроч таго два хранометры — насценны і кішэнны, а калі тыя інструменты і тэлескопы з Парыжа атрымаю, то буду мець поўны камплект, хоць



Маёнтак Раманава

невялікую абсерваторыю, але ў якой можна будзе рабіць усё». Свае навуковыя дасягненні, у асноўным у галіне метэаралогіі, ён апублікаваў у 1866 г. ва французскім часопісе «Космас», а тэорыю К. Крашэўскага, якая датычыць уплыву палажэння Месяца ў суадлежнасці да Зямлі на стан атмасферы пацвердзіў у тым жа часопісе знакаміты навукоўца Генрых дэ Парвіле (Parville).

Акрамя астранамічных даследаванняў ён пісаў гістарычныя аповесці, мемуары, камедыі, займаўся жывапісам і скульптураю. Не забываў і музыку. У тым жа лісце да брата сцвярджаў: «Музыка і астраномія так вельмі дзіўна паміж сабою знаходзяцца ў гармоніі, што заўсёды ад адной да другой пераходжу з найвялікшаю прыемнасцю». Музычную адукацыю Каятан атрымаў у бацькоўскім маёнтку. Добра іграў на фартэпіяна. Пераважна пісаў мініяцюры для гэтага інструмента (у некаторых з іх выкарыстоўваў народныя матывы), а таксама творы для голасу і фартэпіяна на словы Ю. І. Крашэўскага, А. Міцкевіча і інш., спрабаваў сябе і ў больш разгорнутых формах: канцэртах, санатах. Простыя па форме, нескладаныя па фактуры, вобразныя замалёўкі з пранікнёнымі мелодыямі выдаваліся ў Варшаве яшчэ пры жыцці кампазітара. Напрыклад, былі выдадзены ў 50-я гг. фартэпіянная п’еса «L’Absence. Valse Caracteristique» (опус 104), раманс «Po tej rączce» (опус 126) на словы Ю. І. Крашэўскага. Свайму знакамітаму брату Юзафу Ігнацыю, знаўцу гісторыі, ён прысвяціў апрацоўку старажытнага напеву «Bogarodzica» (Варшава, 1855); на словы А. Міцкевіча напісаў раманс «Pierwiosnek» (опус 74; Варшава, 1860).

К. Крашэўскім былі створаны яшчэ для фартэпіяна: накцюрн «Прагулка ў гандоле» (опус 65), «Тарантэла» (опус 62), п’еса «Кахай мяне», фантастычны вальс «На Лысай гары» (опус 84) — творы, якія былі выдадзены ва ўзгаданым вышэй 5-м сшытку серыі: «Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі». Неардынарны, а можа быць і ўнікальны для таго часу напісаны ім Дуэт для фартэпіяна і фізгармоніі ў 3-х частках. А на фізгармоніі любіў музіцыраваць Ю. І. Крашэўскі! У лісце ад 21 красавіка 1856 г. Каятан паведамляў яго: «Дарагі Юзю! Па твайму настаўленню хутка сачыніў Дуэт для фартэпіяна і фізгармоніі <…> і спяшаюся выслаць табе — даруй, што трохі не вельмі чыста, але ўжо не маю сіл трэці раз пісаць, тым болей, што гэта некалькі аркушаў. Не ведаю, ці гэтая кампазіцыя прыйдзецца табе па густу».

Памёр Каятан Крашэўскі ў Старым Купліне 1 ліпеня 1896 г. Захаваўся фотаздымак 1914 г. сядзібы Крашэўскіх у Старым Купліне, мажліва пабудаванай яшчэ ў першай палове XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Старонка прыжыццёвага выдання фантастычнага вальса «На Лысай гары» К. Крашэўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Маёнтак Стары Куплін

Пасля смерці К. Крашэўскага маёмасць спадчынных маёнткаў Раманава і Доўгае засталася за яго малодшым сынам Крыштафам, які ў 1913 г. падарыў рукапісныя зборы Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве, раскошны кнігазбор — бібліятэцы імя Г. Лапацінськага ў Любліне, а астранамічныя прыборы — Варшаўскаму навуковаму таварыству.

Браты Юзаф Ігнацы і Каятан Карашэўскія належаць да людзей, якія праз сваю нястомную шматгранную дзейнасць, вялікія і глыбокія веды ў галінах мастацтва і навукі ўзбагацілі культуру, адшукалі і зберaглі яе многія рарытэты, падаравалі свету тую непаўторную прыгажосць, якая ў жыцці бывае так мала заўважана, а непасрэднымі спадарожнікамі іх заўсёды былі фантазія, чыстае сэрца і вера.

## Літаратура


1. *Живописная* Россия : Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении : Литовское и Белорусское Полесье. — Мінск : БелЭн, 1993. — 550 с. (Репринт. воспроизведение изд. 1882 г.)
2. *Мысцелі* і асветнікі Беларусі : энцыкл. даведнік. — Мінск : БелЭн, 1995. — 671 с.
3. *Танец* і вобраз у музыцы XIX стагоддзя : творы для фартэпіяна / укл. і аўтар уступ. артыкула Я. Паплаўскі ; выканальніц. рэд. І. Алоўнікаў. — Мінск : БелДІПК, 2008. — 56 с.
4. *Aftanazy, R.* Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. — Wrocław, Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1993. — T. 2. — 473 st.
5. *Album* Widoków rysowanych przez J. I. Kraszewskiego, Część I. — Podlasie, Warszawa, 1961.
6. *Kicianka, H.* Twórczość plastyczna Józefa Ignacego Kraszewskiego. — Kraków : Muzeum Narodowe w Krakowie, 1985. — 54 st.
7. *J. I. Kraszewski* i polskie życie muzyczne XIX wieku / Opracował Stefan Świerzewski. — Kraków : Polskie Wydawnictwo Muzyczne, 1963. — 334 st.
8. *Kraszewski, J. I.* Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy. — Paryż, 1860.
9. *Nitowski, J.* Zarys historyi literatury Polskiej. — Warszawa, Nakładem i drukiem M. Arsta, 1906. — St. 168—178.
10. *P.[ług] A.* Rysunki J. I. Kraszewskiego — winiety z jego listów w : «Kłosy». — Warszawa, 1887, — t. 1, nr. 1156.
11. *Polski* Słownik Biograficzny. T. 15. — Wrocław, PAN, 1970 (życiorysy Kraszewskich).
12. *Skowronek, J.* Młodzież polska i jej organizacje w ruchu narodowym 1795—1864. — Warszawa : Wydawnictwo Neriton, 1994. — 88 st.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ